# РУХ за свабоду

Бюлетэнь ПАГА “Рух “За Свабоду”. Выпуск № 1 красавік 2011



Праеўрапейцаў сярод беларусаў усё болей – с. 2

”Эканамічныя санкцыі могуць даць адваротны эфект – с. 3

“Апазіцыі пара мяняць пласцінку” – с. 4-5

“19 снежня 100% выйграла Расія” – с. 6-7




# Рухаўца зрабілі палітвязнем

**20-гадовы Мікіта Ліхавід асуджаны на 3 з паловай гады калоніі ўзмоцненага рэжыму за Плошчу 19 снежня. Хлопец будзе падаваць касацыю ў Вярхоўны суд, а ў выпадку яе незадавальнення наважаны абвесціць галадоўку.**

У судовым працэсе бралі ўдзел ажно тры дзясяткі пацярпелых спецназаўцаў! І ніводны з іх не выказаў прэтэнзій да актывіста Руху “За Свабоду”. Па словах маці Мікіты Алены Ліхавід, нават яны былі ўражаныя суворасцю прысуду.

“*У мяне, вядома, была надзея, што прысуд будзе хаця б умоўны, бо і расейцы са штрафамі выйшлі, і Мядзведзь. Бяда ў тым, што ў майго дзіцяці беларускі пашпарт. Так атрымліваецца, што калі зараз адпусціць майго Мікіту і вынесці яму апраўдальны прысуд, тады трэба адпускаць усіх, спыніць усе судовыя справы, спыніць пераслед, арышты...*”, – заявіла кабета ў інтэрв’ю радыё “Свабода”.

Яна звяртаецца да ЕС ад усіх жонак і мацярок: “Пачынайце нешта рабіць! Таму што візавых санкцыяў мала”.

Разам з тым Алена Ліхавід адзначае салідарную падтрымку: “Вы ведаеце, я за гэты час набыла вельмі шмат сяброў, і Рух “За Свабоду”, і “Салідарнасць”, і бацькі і жонкі зняволеных – вялікі дзякуй усім і нізкі паклон. Я ўбачыла, што вельмі многім неабыякава ўсё, што адбываецца”.

Суды над удзельнікамі Плошчы – не праваўыя дзеянні, а захады палітычнай мэтазгоднасці кіраўніцтва краіны, такім ёсць і неадэкватна жорсткі прысуд Мікіце Ліхавіду, сказаў лідар Руху “За Свабоду” Аляксандр Мілінкевіч:

“*Судовы працэс над ім стаў чарговай палітычнай справай дзеля нагнятання ў грамадстве атмасферы страху. Я казаў у якасці сведкі на судзе, што Мікіта Ліхавід прыстойны, адукаваны і неабыякавы малады чалавек, не схільны да агрэсіўных дзеянняў. Натуральна, я не магу ведаць асабіста ўсіх рухаўцаў, але Мікіту ведаю асабіста, таму кажу пра гэта ўпэўнена. Такой моладзі паболей бы ў Беларусі, а яе садзяць за краты як ворагаў народу! Вось так цяперашнія ўлады дзеля захавання рэпрэсіўнага кантролю над грамадствам нішчаць перспектывы для краіны ў шмат якіх кірунках*”.

Актывісты Руху “За Свабоду” выказваюць абсалютную салідарную падтрымку свайму паплечніку: “Мікіта, трымайся!”

# “Тэрарызм – не наша традыцыя”

**На станцыі метро Кастрычніцкая ўвечары 11 красавіка адбыўся выбух. Ёсць ахвяры. Трагічную падзею каментуе Аляксандр Мілінкевіч.**

Паводле апошніх звестак, 12 чалавек загінула, блізу 200 − паранена.

Лідэр Руху “За Свабоду” Аляксандр Мілінкевіч перакананы, тэрарызм − гэта не наша гісторыя і традыцыя. Здзейсненне тэракту выгаднае тым сілам у краіне і за яе межамі, што зацікаўленыя ў дэстабілізацыі абстаноўкі ў Беларусі. Гэтым сілам важна справакаваць яшчэ больш жорсткія палітычныя рэпрэсіі і ў выніку руйнаваць шанец нашай дзяржавы на еўраінтэграцыю, аслабляць яе незалежнасць.

ТЭНДЭНЦЫЯ

# Праеўрапейцаў усё болей



**Электаральны рэйтынг Аляксандра Лукашэнкі знізіўся за тры месяцы на 10,1 пункта, паведамілі ў Незалежным інстытуце сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў.**

Было 53%, стала такім чынам 42,9% – гэтакія вынікі сакавіцкага апытання. У 2006 годзе тэмп падзення рашэння быў амаль удвая менш.

Раней сацыёлагі прагназавалі рэмейк 2001-2002 гадоў, калі рэйтынг Лукашэнкі апусціўся да гістарычнага мінімуму ў 26%.

Яшчэ адна прыкметная тэндэнцыя – пасля-выбарны рост праеўрапейскіх настрояў у краіне. Прычым выраслі яны значна. І гэта нягледзячы на няспынную антызаходнюю прапаганду цягам трох паслявыбарных месяцаў. Нават насуперак ёй.

У снежні, напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў, апытанне НІСЭПД зафіксавала 35% беларусаў, якія б сказалі на гіпатэтычным рэферэндуме “так” уступленню Беларусі ў Еўрасаюз. У сакавіку такіх ужо 49%. Рост у амаль 15% уражвае! Для параўнання, за аб’яднанне з Расіяй выступаюць 29% (у снежні было 30%).

СТРАХУ НЯМА



## “Здам адбіткі пальцаў толькі пасля Лукашэнкі”

“У пятніцу вечарам, калі мяне не было дома, заходзіў афіцэр міліцыі, каб на месцы зняць мае адбіткі пальцаў. З камунікацыі праз дзверы з маёй жонкай, ён зразумеў, што мне такі хатні сэрвіс не пасуе”, – распавёў дарадца старшыні Руху “За Свабоду” Алесь Лагвінец у сваім LJ.

Каб участковы ды іншыя афіцэры выкарыстоўвалі свой працоўны час на іншыя, больш карысныя для грамадства рэчы (барацьба са злачыннасцю), Лагвінец вырашыў напісаць іхняму начальству заяву, у якой кажацца, што ён будзе гатовы да працэдуры дактыласкапіі толькі пасля таго, як яе публічна пройдуць шэраг высокіх чыноўнікаў. У прыватнасці: “Асоба, якая займае пасаду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь; дэпутаты Рады Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў; старшыня Рады Міністраў і міністры; Генеральный Пракурор; суддзі Канстытуцыйнага і Вярхоўнага судоў; старшыня Камітэту дзяржаўнай бяспекі…”

КАМЕНТАР

## :) і :( ад Аляксандра Мілінкевіча



**На сайце Рух.by Аляксандр Мілінкевіч пачаў весці рубрыку пра, умоўна кажучы, плюсы і мінусы тыдня, які прамінуў. Лідар Руху вызначае па адной падзеі з негатывам і пазітывам.**

Некалькі цытатаў:

“Сёння сусед-шафёр пытаўся, чаму мы аб’ядноўваемся са значна горшым заводам, а не з лепшым. “Я б звольніўся з працы, як мяне б прымушалі перасесці на КамАЗ”, – кажа ён”.

“Пераход на мытныя тарыфы на ўвоз аўто ў памерах, якія дзейнічаюць у Расіі, можа быць адтэрмінаваны. Тым больш на тле татальнага падаражання гэта ўдар па пазіцыях улады. Калі не – гэта будзе азначаць, што Масква ўсур’ёз нахіліла Лукашэнку”.

“Выдатна прабавіў час на канцэрце Віктара Шалкевіча і заадно прэзентацыі ягонай кніжкі. Ён мой зямляк і сябра. Для мяне асабіста важна тое, што ён робіць сваім талентам. Ён адыграў вялікую ролю ў маім жыцці. Без Віктара я быў бы бяднейшы духоўна… Шалкевіч шмат пра што кажа дасціпна, пранікнёна і іранічна – так, што гэта западае ў сэрцы. Я лічу яго не толькі геніяльным бардам, але і выдатным паэтам”.

“Браў удзел у нефармальным Саміце Еўрапейскай народнай партыі, на які з’ехаліся альбо кіраўнікі многіх краінаў, уваходзячых і не ўваходзячых у ЕС, альбо лідары тамтэйшых апазіцый… Вельмі цёплую сустрэчу з Юліяй Цімашэнкай адзначу асобна: дынамічная і валявая жанчына, добра трымаецца, нягледзячы на пераслед цяперашняй улады ва Украіне. Нам вельмі не хапае такіх прыгожых і з лідарскімі якасцямі жанчын на першых ролях у палітыцы. Яны часцяком маюць талент генераваць новыя ідэі і слушныя падыходы, дэманстраваць прыклад мэтанакіраванасці многім мужчынам-палітыкам”.

ПАЗІЦЫЯ

# Эканамічныя санкцыі могуць даць адваротны эфект

**У Еўрасаюзе разглядаюць магчымасці ўвядзення эканамічных санкцыяў адносна Беларусі.**

Пазіцыя Руху "За Свабоду" па пытанні эканамічных санкцый – яны павінны быць як след прадуманыя, каб не прывесці да адваротнага эфекту на шкоду іміджу беларускай апазіцыі.

"Рух "За Свабоду" засцерагаецца ад непрадуманых дзеянняў, якія не будуць мець эфекту, альбо будуць мець эфект, адваротны чаканаму. Гэта рашэнне павінна прымацца ў залежнасці ад меркаўнага выніку. Таксама трэба ўлічваць, што абгрунтаванне ўвядзення эканамічных санкцый павінна быць даведзена да беларускага насельніцтва. Калі ў выніку такога рашэння стаўленне насельніцтва да апазіцыі яшчэ больш пагоршыцца, а дзяржаўная прапаганда зробіць усё магчымае, каб так і адбылося, але неабходныя вынікі не будуць дасягнутыя, мы лічым, што такія дзеянні не з'яўляюцца апраўданымі", – даводзіць Юрась Губарэвіч, намеснік старшыні Руху "За Свабоду".

Дарэчы, вось якія вынікі сакавіцкага апытання НІСЭПД па гэтай праблеме. Новыя санкцыі, уведзеныя Еўропай і ЗША ў адносінах да кіраўніцтва Беларусі пасля прэзідэнцкіх выбараў, станоўча ацанілі 17,5% беларусаў, адмоўна – 37,7%, абыякава гэта 38,9%, а прапановы ўвесці дадаткова эканамічныя санкцыі – адпаведна 16,6% , 44,2%, 39,1%.

Панацэйныя спадзевы часткі апазіцыі на эканамічныя санкцыі (і адпаведныя заклікі) – вынік



ейнай кволасці і комплексу праз гэта. На жаль, вырашэнне шмат якіх праблемаў (у прыватнасці, вызваленне палітвязняў) мала залежыць ад дэмсіл, а больш ад эканамічнай сітуацыі ўнутры Беларусі і ўзгодненай пазіцыі дэмакратычных дзяржаў.

Што апазіцыя можа зрабіць, каб стаць больш уплывовай?

"Перш за ўсё працаваць з насельніцтвам і даваць адказы на пытанні, якія хвалююць нас сёння – з эканомікай, з іншымі праблемамі. Таксама праводзіць вялікую тлумачальную працу з людзьмі адносна сваіх прапаноў. Апазіцыя павінна прапанаваць альтэрнатыўнае бачанне будучыні Беларусі", – сказаў Губарэвіч у інтэрв'ю радыё "Рацыя".

ЕЎРОПА БЕЗ МЕЖАЎ

# У кааліцыі "Без візы"




**Рух "За Свабоду" ўвайшоў у кааліцыю беларускіх і еўрапейскіх прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, якія выступаюць за бязвізавы рух паміж Беларуссю і краінамі Еўрасаюзу.**

Паводле Беларускага інстытуту стратэгічных даследванняў даследаванняў, сярод тых, хто наведваў ЕС часцей за два разы, праеўрапейскія настроі вышэйшыя на 20-60% у залежнасці ад узросту.

Дар'я Слабчанка, якая прадстаўляе Рух "За Свабоду" у кааліцыі, кажа:

"Рух заўсёды меў адным са сваіх прыярытэтаў спачатку зніжэнне кошту візаў, а потым і іх адмену. Мы заўсёды падкрэслівалі, што спрашчэнне візавага рэжыму ў выпадку Беларусі – не пернік уладам, а адзін з самых эфектыўных інструментаў па дэмакратызацыі нашага грамадства".

САНКЦЫІ

# Клюшкай па Лукашэнку

Гомельскія актывісты Руху "За Свабоду" – за пазбаўленне афіцыйнага Мінска чэмпіянату свету па хакеі-2014, калі не будуць вызваленыя ўсе палітвязні. Кіраўнік абласной філіі Пётр Кузняцоў выступіў з прапановай звароту ў Міжнародную федэрацыю хакея ад імя дэмакратаў Гомельшчыны.

"Я добра разумею, што шмат хто з беларусаў можа не падтрымаць гэтую ініцыятыву. Маўляў, апазіцыянеры хочуць пазбавіць Беларусь спартовага свята. Але, прынамсі, маё меркаванне такое: калі ў краіне ёсць палітычныя вязні, для сучаснай дзяржавы – гэта жалоба. Гэта насамрэч жалоба і трагедыя таго маштабу, калі ўвогуле ўсе забаўляльныя мерапрыемствы трэба забараняць. Мы не можам жыць надзеямі на нейкае свята, калі людзі бязвінна знаходзяцца за кратамі", – заявіў Кузняцоў.

# Віктар Карнеенка: “Апазіцыі пара мяняць пласцінку!”

**Прамінула пяць год ад прэзідэнцкіх выбараў і Плошчы 19.03.2006. Тыя падзеі, параўноўваючы з выбарчай кампаніяй 2010 года, аналізуе, а таксама распавядае эксклюзіўныя дэталі тагачасны намеснік кіраўніка штаба адзінага кандыдата ў прэзідэнты ад апазіцыі Аляксандра Мілінкевіча Віктар Карнеенка (цяпер намеснік старшыні Руху “За Свабоду”).**


PHOTO.BYMEDIA.NET

– Натуральна, тая выбарчая кампанія мела свае плюсы і мінусы. Галоўны плюс – адзіны кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Мілінкевіч, які быў знойдзены не ў палітычнай лабараторыі. Ён з’явіўся не з прабіркі, а праз дэмакратычную спаборніцкую працэдуру. У 2006 годзе, натуральна, была большая кансалідацыя, чымсьці ў 2010-м.

Мінус: надта доўга апазіцыя высвятляла адносіны паміж сабой, элементарна згубіла шмат часу. Наша каманда настойвала на правядзенні Кангрэсу дэмсіл з вызначэннем адзінага як мага раней, але яго дату ўвесь час пераносілі. У выніку прызначылі пад самыя выбары.

Нарэшце, у кааліцыі былі сур’ёзныя ідэалагічныя разыходжанні, што абумовіла невыразнасць праграмы праз жаданне задаволіць усе ідэалогіі. З боку некаторых быў сабатаж працы на адзінага.

Але галоўнай была згуба часу. Ва ўмовах, па сутнасці, датэрміновых выбараў разлічваць на перамогу не выпадала. Таму кааліцыйны штаб быў вымушаны ставіць рэальныя задачы на



кампанію – дасягнуць падтрымкі насельніцтва не менш за 30%. І гэта ўдалося, як і дамагчыся 80% пазнавальнасці. Але змяніць сітуацыю кардынальна за месяц было немагчыма.

**– Галоўны закід, які гучыць дасюль, - у каманды Мілінкевіча быў няўцямны план дзеянняў.**

– Стратэгія і план кампаніі, у тым ліку акцыі пратэсту, былі.

Сутнасць – разлік на тое, што колькасць пратэстуючых будзе нарастаць да крытычнай масы. Скажам, 100 тысяч, што можа стаць механізмам змены ўлады. Таму мы рабілі ўсё, каб пазбегнуць жорсткага канфлікту і сілавога разгону акцыі, што зрабіла б немагчымым павялічэнне колькасці пратэстуючых. Я і сёння перакананы, што галоўны крытэр паспяховасці любой масавай акцыі ёсць якраз колькасць удзельнікаў.

Але ў любым выпадку для змены ўлады патрэбна электаральная перамога апазіцыі. Калі ж яе няма, спадзявацца на нейкія крэатыўныя хады ці спецэфекты паліттэхнолагаў есць звычайнае шарлатанства. Іншымі словамі з дапамогай Плошчы можна не перамагчы, а толькі адстаяць перамогу.

19 снежня памылкай штабу Уладзіміра Някляева стала тое, што дапусцілі яго нейтралізацыю. Калона магла рушыць на месца збору акцыі пратэсту, але весці яе павінен быў ніяк не кандыдат. Дый наогул незразумела, ці была нейкая стратэгія на гэты дзень у кагосьці з кандыдатаў.

У 2006 годзе мы разумелі, што заўчасная ізаляцыя Аляксандра Мілінкевіча можа сарваць акцыю пратэсту, а таму перадухілілі гэта. Мы знайшлі спосаб вывесці яго раніцай дня галасавання з-пад вонкавага назірання, і да вечара ён знаходзіўся ў бяспечным месцы. Супрацоўнікі спецслужбаў, што забяспечвалі вонкавае назіранне, былі разгубленыя – бегалі ад Акадэміі міліцыі да ЦУМу па праспекце, шукалі.

*У любым выпадку для змены ўлады патрэбна электаральная перамога апазіцыі”*

Мы дапусцілі і памылкі. Думалі, што Кастрычніцкая плошча будзе закрытая, але заклікалі на яе, каб перабрацца потым у парк Горкага. Туды меркавалася даставіць гукаўзмацненне, намёты і лісты ДВП, на якіх яны будуць стаяць. Парк Горкага быў абраны, каб не правакаваць уладу на жорсткія дзеянні. Пратэст мусіў быць мірным, таму што колькасць дэманстрантаў не будзе нарастаць, калі іх б’юць, калі ёсць напружанне.

Плошча аказалася адкрытай, а мы не мелі досведу, што пры вялікай колькасці народу перагружваецца сетка – і не працуюць сотавыя тэлефоны. Перастаў працаваць радыётэлефон сувязі з Мілінкевічам.

Пакуль выпраўлялі нечаканыя

# “Апазіцыі пара мяняць пласцінку пласцінку!” (працяг)

хібы, атрымалася затрымка па часе.

Не магу прыняць крытыкі, што Мілінкевіч павёў калону “не туды, куды трэба!”. Была нарада ў якой бралі ўдзел не менш за 20 палітыкаў, у тым ліку са штабу Аляксандра Казуліна. Першая прапанова ісці на Плошчу Перамогі з кветкамі прагучала якраз ад Казуліна, і гэтаму ёсць відэадоказы. Праўда і ў тым, што мы не сталі гэтаму пярэчыць. Было вырашана працягнуць акцыю на заўтра са спадзевам, што прыйдзе болей людзей.

Паўтаруся, стаўка рабілася на нарастанне колькасці пратэстуючых.

Але не атрымалася. Не прыехалі тысячы людзей з рэгіёнаў, не застрайкавалі заводы, не здэтаніравала грамадства. Магчыма, прычынай стала тое, што, нават ведаючы пра фальсіфікацыі, пра прыпіскі ў выніковых пратаколах на карысць Лукашэнкі, людзі адчувалі, што апазіцыйныя кандыдаты яго не перамаглі.








**– Дык на што выходзіць тады было на Плошчу наогул, калі перамогі няма?**

– Дамагацца праўдзівых вынікаў выбараў. У 2006 годзе Мілінкевічу альтэрнатыўныя экзіт-полы давалі каля 30%. І гэта была добрая магчымасць працаваць разам на перспектыву – быў відавочны лідар, каманда, значная электаральная падтрымка і высокая кансалідацыя апазіцыйных сіл. Узгадайце інаўгурацыю 2006 года, успомніце пра настроі грамадства! Тое, што потым адбылося на Кангрэсе дэмсіл у 2007 годзе – самая вялікая памылка апазіцыі. Замест абрання адзінага лідэра, зрабілі дзіўнае сустаршынства. Атрымалася аморфная структура без персаніфікацыі палітычнай альтэрнатывы Лукашэнку. Засядалаўкі…

Вынік – 9 кандыдатаў у прэзідэнты ў 2010 годзе, дэмабілізацыя актывістаў, незразумеласць, чаго дамагаліся кандыдаты.

Прычым размова не вялася тады пра абранне адзіным кроў з носу Мілінкевіча. Гэтыя 30% падтрымкі дэмакратычнай часткі грамадства маглі б пайсці і другому палітыку. Галоўнае – патрэбны быў адзіны лідар, якога можна было б раскруціць за працяглы час на агульнанацыянальнага ўзроўню.

**– А што рабіць з вулічнымі акцыямі? Мо адкінуць ідэі фікс – “не пойдзем ні за што на Бангалор”, а пастарацца сабраць мірна там 50 тысяч чалавек, скажам?**

– Ёсць выпадкі, калі варта выйсці пратэставаць нават і аднаму чалавеку. Ёсць сімвалічныя акцыі ў даты, якія мы шануем. Як 25 сакавіка. Але трэба ўсур’ёз задумацца, як праводзіць вулічныя акцыі, шукаць іншыя сцэнары, а галоўнае, дамагацца падтрымкі і разумення сваіх прапаноў і ідэй у большасці людзей.

Праблема сёння – не ў тым, куды ісці, якія лозунгі агучваць. Галоўнае – у разуменні насельніцтвам стратэгіі і планаў апазіцыі. Што яна хоча, якая ў яе праграма? А праграма не можа быць спрэс пра крывавы рэжым. Там павінен быць пазітыў. Апазіцыі пара мяняць пласцінку!

Pyx.by


PHOTO.BYMEDIA.NET

# Аляксандр Мілінкевіч: 19 снежня на 100% выйграла Расія

**Лідар Руху “За Свабоду” Аляксандр Мілінкевіч аналізуе прэзідэнцкую кампанію-2010. У прыватнасці, распавядае пра тое, якіх правакацый чакаў падчас акцыі 19 снежня, і хто атрымаў найбольшыя дывідэнды, дзякуючы гвалтоўнаму фіналу.**

– Я быў ўсцешаны, што на Плошчы сабралася так шмат людзей. Гэта было для мяне, як і для многіх, нечакана. Бо кандыдаты не аб’ядналіся, не было гэтага мабілізуючага фактару. Але зноў жа, з іншага боку, дзякуючы “разгулу дэмакратыі” падчас збору подпісаў і агітацыі, страху стала значна менш, і пратэстныя настроі ў краіне выраслі. Усё гэта вывела людзей на вуліцу, нягледзячы на адсутнасць адзінства апазіцыі.

У мяне была вельмі вялікая трывога перад гэтай акцыяй. Я яшчэ з лета казаў, што магчымы правакацыі. Праўда, не такіх я правакацый чакаў. Да мяне даходзілі чуткі, што будзе ўчынены які-небудзь выбух, будуць “арганізаваны” сутычкі з міліцыяй, перакуленыя машыны. Іншымі словамі, правакацыі, каб дыскрэдытаваць апазіцыю: маўляў, тыя, што пад бел-чырвона-белымі сцягамі – яны радыкальныя, яны крывавыя.

Але такога сцэнару з пераходам на другую плошчу і штурму Дома ўрада я, канешне, не чакаў. Я проста думаў, што мы можам выйсці з гэтай кампаніі са значна папсаваным іміджам у вачах грамадства і непакоіўся за наступствы.

**– Вы кажаце, што ў вас шмат прэтэнзій да кандыдатаў. Але многія з іх таксама шмат у чым абвінавачвалі вас за мінулую кампанію і ішлі выпраўляць менавіта вашы памылкі...**

– У 2006 годзе атмасфера была зусім іншай: пераслед у час збора подпісаў, большасць сходаў – без дазволу ўладаў, у дзень выбараў – сотні членаў нашых штабоў у турме, на тэлебачанні галоўны КДБіст, Генпракурор і міліцэйскі міністр папярэджвалі, што пратэстоўцы будуць разглядацца як тэрарысты, значыць – ажно да растрэлу.

Нягледзячы ні на што, на Плошчы сабралася больш за 30 тысячаў. Было пачуццё свята, свята перамогі над страхам і нараджэння грамадзянскай Беларусі. Але тое, што мы тады не пайшлі гуляць па горадзе, я і сёння лічу правільным. Гэта бы скончылася збіццём, крывёю, магчыма, ахвярамі.

У нас была ясная задача – за кошт мірнай шматдзённай акцыі дамагчыся сталага павялічэння колькасці пратэстуючых. Мы лічылі, што толькі нерадыкальная Плошча можа нарастаць дзень за днём. Так развіваліся ў свой час падзеі ў Празе, Белградзе, Кіеве, у іншых каляровых рэвалюцыях.

Мы не дасягнулі мэты. Не за-

# 19 снежня выйграла Расія (працяг)

страйкавалі заводы, не апусцелі ўніверсітэты. Нас падтрымалі многія, але мы не перамаглі ў розумах большасці.

Дарэчы, уначы, напярэдадні тых выбараў, я сустракаўся з людзьмі, якія рыхтавалі радыкальныя дзеянні. Спыніў іх, бо на сумленнай Плошчы не можа быць некалькі рэжысёраў…

Правільна – выбраць адзіны сцэнар і цвёрда яго трымацца. Правільна – умець прадугледзець і нейтралізаваць правакацыйны сцэнар. Правільна – не гуляць у палітыку.

*Нас падтрымалі многія, але мы не перамаглі ў розумах большасці*

Перад Плошчай 2010 года не раз кандыдаты казалі: мы пойдзем да канца, мы не паўторым памылак мінулай кампаніі. Згодзен, калі ты ўпэўнены, што перамог, а перамогу скралі, калі ў тваю падтрымку выходзіць пераможная колькасць выбаршчыкаў, тады так – трэба ісці на адміністрацыі, рэзідэнцыі, тэлебачанні... І пры гэтым мусіць быць план, які рэальны і дае вынік. А калі гэтага ўсяго няма, то і фінал адпаведны. Ты не суб'ект, а аб'ект.

Краіна адкінута ў адносінах з цывілізаваным светам на шмат гадоў назад, суверэнітэт – пад крытычнай пагрозай. Вы скажаце – гэта ўсё зрабіў Лукашэнка. Але і апазіцыя нясе сваю вялікую долю адказнасці за той стан, у якім сёння апынулася краіна.

**– Вы ўвесь час кажаце пра мірную плошчу, але падзеі у Егіпце і Тунісе паказваюць, што дзеля перамогі практычна непазбежныя ахвяры.**

– Наш абавязак рабіць усё, каб іх не было. На Майдане ні адзін волас не ўпаў з галавы міліцыянера ці "памаранчавага". Так было ў Грузіі, Сербіі. Каб пазбегнуць новых ахвяраў, лідэры "Салідарнасці", маючы за сабой 10 мільёнаў палякаў, селі за "Круглы стол" з тымі, хто аддаваў загады страляць у дэманстрантаў.

Безумоўна, ёсць шмат прыкладаў, калі людзі гінулі за свабоду.



PHOTO.BYMEDIA.NET

Ты можаш аддаць сваё жыццё за справядлівасць. Але зусім іншае пасылаць на магчымую смерць людзей, калі ты не ўпэўнены, што гэта прынясе вынік, ахвяраваць іх дзеля ўласных амбіцый. Палітык не мае права на авантуру, калі паклікаў за сабой людзей. Лідэр нясе персанальную адказнасць за тых, хто ў яго паверыў.

Нельга гуляць з людзьмі. І калі ты не разумееш, да чаго прывядзе твой сцэнар, лепш яго не рэалізоўваць.

*Палітык не мае права на авантуру, калі паклікаў за сабой людзей. Лідэр нясе персанальную адказнасць за тых, хто ў яго паверыў.*

**– Падсумаваўшы інфармацыю апошніх месяцаў, сёння ў вас ужо ёсць разуменне таго, што адбылося і чаму менавіта так?**

– Хутчэй версія. Я думаю, што ў час кампаніі рэалізоўвалася адразу некалькі сцэнараў. Быў сцэнар апазіцыі (дакладней, сцэнары, бо агульнага не было), быў у некалькіх варыянтах сцэнар Масквы, паўстаў сцэнар улады. Я не ведаю дакладна, ці быў сцэнар Захаду, я яго не адчуваю, але, напэўна, таксама быў, напрыклад, у падтрымцы некаторых кандыдатур. І тое, што адбылося, гэта хутчэй спляценне гэтых сцэнараў.

Але, калі казаць пра тое, як яны рэалізаваліся, то лепш за ўсё паглядзець на вынікі. І па выніках выйграла на 100% Расія.

Зараз мы "берлінскай сцяной" аддзелены ад ЕС, дэмакратычная апазіцыя значна аслаблена і структурна і маральна, пад уздзеяннем прапагандысцкай машыны паніжаюцца і праеўрапейскія настроі, і будуць яшчэ паніжацца. Зараз прапаганда фармуе вобраз Захаду як ворага, як арганізатара нейкай змовы, а апазіцыі як радыкальных "агентаў імперыялізму". Ідзе аслабленне дэмакратычных сілаў, спыніўся рух інтэграцыі ў Еўропу. І для Расіі гэта важна – пакінуць Беларусь у зоне свайго максімальнага ўплыву.

Пасля падзеяў 19 снежня мы прайграем краіну, паскорана губляем эканамічную самастойнасць. Рэжым ўжо пачаў плаціць Маскве за лаяльнасць пабудовай расійскай АЭС у крэдыт, і прыватызацыяй лепшых прадпрыемстваў, пачынаючы з МАЗу.

Лукашэнка на 50% выйграў, на 50% прайграў. Выйграў у тым, што мае магчымасць зараз дыскрэдытаваць апазіцыю і зачышчае палітычнае і грамадскае поле. А прайграў у тым, што папсаваў вельмі важныя адносіны з ЕС і ЗША.

Захад у выніку выбараў згубіў эфектыўныя інструменты ўплыву на нашу ўнутраную сітуацыю.

А што выйграла апазіцыя? Гэта вельмі важнае для мяне пытанне і самае складанае. Я не ведаю што…

**("Салідарнасць", працяг будзе)**

Адзін з малюнкаў, дасланых на конкурс




# “Страху няма!”

**Конкурс з такой назвай праводзіцца ў межах аднайменнай кампаніі, якую ладзіць ініцыятыва “Беларускі выбар” (Рух “За Свабоду”, Саюз “За мадэрнізацыю”, Партыя БНФ, Беларуская партыя “Зялёныя”, аргкамітэт па стварэнні Партыі свабоды і прагрэсу).**

Мэта кампаніі – разбурэнне атмасферы страху ў грамадстве, кансалідацыя прыхільнікаў перамен на глебе агульнай перамогі над страхам, які прадукуе дыктатура. Страх можна разбураць рознымі спосабамі: асабістым прыкладам, давядзеннем сітуацыі да абсурду, гумарам і сатырай, праявамі салідарнасці і іншымі.

Мэта конкурса – крэатыўныя ідэі па рэалізацыі слогану кампаніі “Страху няма!” (лозунгі, фота, відэа, малюнкі, коміксы, гісторыі з рэальнага жыцця і мастацкія нарысы). Умовы і творчыя працы, якія можна ацэньваць галасаваннем, – на сайце конкурса svaboda.eu. Пераможцы атрымаюць падарункі.

# Рух “За Свабоду” вартуе сядзібу Партыі БНФ

**Сябры Руху “За Свабоду” бяруць удзел у начной вахце па абароне офісу Партыі БНФ**

Нагадаем, Партыя БНФ настойвае на справядлівым разглядзе ў судзе справы наконт непрацягвання ЖРЭА дамовы пра арэнду памяшкання пад мінскую сядзібу. І да рашэння суду ладзіць з 1 красавіка, калі перастала дзейнічаць арэндная дамова, кругласуткавае дзяжурства ў офісе па праспекце Машэрава, 8, каб запабегчы гвалтоўнаму яго адабранню.

Рашэнне камунальнай арганізацыі з’яўляецца палітычна матываваным, лічаць франтаўцы. Яно было прынятае падчас акцыі салідарнасці, калі на сядзібе збіраліся рэчы і грошы на дапамогу затрыманым 19 снежня.

У прыватнасці, намеснік старшыні Руху “За Свабоду” Юрась Губарэвіч і дарадца старшыні Алесь Лагвінец ужо пабывалі на варце “Выспы Свабоды” ў цэнтры Мінска.

“Гэта праява салідарнасці па абароне сапраўды культавага месца, якое два дзесягоддзі было вольнай пляцоўкай для нацыянальнага дэмакратычнага руху Беларусі”, – зазначае Губарэвіч.

# Сям’і прыхільнікаў Руху патрэбна дапамога

У актывісткі дэмакратычнага руху Таццяны Грачанікавай выявілі падазрэнне на злаякаснасць пухліны, якая яшчэ летам лічылася дабраякаснай, якраз напярэдадні 19 снежня. Узнікла патрэба ў неадкладнай аперацыі...

19-га Таццяна пайшла на Плошчу, дзе была збіта і затрымана супрацоўнікамі сілавых структураў. Грачанікаву пакаралі 15 суткамі арышту. Яна звяртался да суддзі з просьбаю аб змене формы пакарання, зважаючы на хваробу, а таксама – да начальніка турмы па дазвол патэлефанаваць, каб паведаміць родным ці адвакату. На усе яе звароты былі атрыманыя пісьмовыя адмовы.



Пасля вызвалення ёй давялося паўторна здаваць аналізы, з прычыны чаго аперацыя была адкладзена амаль на два месяцы. У выніку Таццяне дыягнаставалі рак спачатку II, а цяпер ўжо III ступені.

Муж Таццяны, прыхільнік Руху “За Свабоду” Юрась Шпак-Рыжкаў быў сябрам выбарчай камісіі ад апазіцыі ў леташняй выбарчай кампаніі. Пасля затрымання на Плошчы (ён разам з жонкай трапіў у пастку спецназу) адсядзеў 10 сутак. Нягледзячы на тое, што на ягоным утрыманні знаходзілася цяжкахворая жонка, дырэктар прадпрыемства “Мингорсвет” звольніў сумленнага работніка па артыкуле “за прагулы”.

Таццяне Грачанікавай патрабуецца неадкладнае лячэнне, а сям’і – фінансавая дапамога.

Рэквізіты для пералічэння сродкаў:

*Грачанікава Таццяна Анатольеўна*

*Беларусбанк*

*філіял 511*

*аддзяленне 273*

*рахунак 000 001*

*9004-РДабрачынны рахунак бел.руб*

Выказаць сваю падтрымку можна па тэлефонах 214-64-03, 3141401(МТС).

Газета выдаецца Рухам “За Свабоду”. Наклад 299 ас. Распаўсюджваецца на правах унутранай дакументацыі бясплатна. Падпісана ў друк 12.04.2011 г.
Кантакты Рэдакцыі: тэлефон: 2808865, е-пошта: info@milinkevich.org